шений. Региональные СМИ наиболее приближены к местной аудитории, поэтому в первую очередь должны быть обращены к освещению местных проблемных ситуаций, далее – на их решение. Следует сделать упор на местные тренды. Редакции следует внедрять жанр «трендовой статьи» – с помощью медиатекстов в этой форме можно раскрывать суть процессов, происходящих в регионе и влияющих на общественную и гражданскую жизнь. Это позволит поднять как общий уровень журналистики на региональном уровне, так и популярность районных/областных изданий.

## Библиографические ссылки


1. *Саянова Н. В*. Система жанров современных региональных газет Беларуси (на примере районной прессы) // Рэгіянальныя СМІ Рэспублікі Беларусь у лічбавую эпоху: ад лакальнай праблематыкі да інфармацыйнай бяспекі дзяржавы : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 5 мая. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. М. Самусевіч (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2020. С. 264–269.
2. *Михайлов С. А*. Журналистика стран Северной Европы М. : Изд-во Михайлова В. А, 2002. [Электронный ресурс]. URL: http://evartist.narod.ru/text14/44.htm (дата обращения: 27.04.2021).


# РУБРЫКА «СЯМЕЙНЫ БАРОМЕТР» НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «ЛЯХАВІЦКІ ВЕСНІК»


***Л. Г. Шасцярнёва***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*lilija.s0607@gmail.com*



У матэрыяле аналізуюцца публікацыі з рубрыкі «Сямейны тэлебарометр», даследуюцца асаблівасці функцыянавання канцэпту «сям’я» ў сучасным перыядычным друку на матэрыяле раённай газеты «Ляхавіцкі веснік». Прасочваецца эвалюцыя паняцця сям’я, што адлюстроўвае адрозненні архаічнага і сучаснага светапогляду.



***Ключавыя словы:*** рубрыка; канцэпт; сям’я, сямейныя каштоўнасці; дом; дзеці.

# THE SECTION «FAMILY TELEBAROMETER» IN THE NEWSPAPER «LYAKHOVITSKY VESNIK»

***L. G. Shastsarneva***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: L. G. Shastsarneva (lilija.s0607@gmail.com)*

The article analyzes publications from the «Family Telebarometer» section, explores the peculiarities of functioning of the concept of «Family» in modern periodicals on the material of the district newspaper «Lyakhovitsky Vesnik». The evolution of the concept of «family» is traced, reflecting the differences between the archaic and modern worldviews.

***Key words:*** heading; concept; family, family values; house; children.

У сістэме каштоўнасцей чалавека сям'я займае адну з асноўных пазіцый. Такія перыядычныя выданні, як «Сацыяльна-педагагічная праца», «Адукацыя і выхаванне», «Звязда», «Народная газета», «Гуманітарна-эканамічны веснік», «Народная асвета», «Праблемы выхавання», «Планета – семья», «Алеся», «Пачатковая школа», «Минская школа сегодня», «Воспитание школьников» акцэнтуюць увагу на актуальных пытаннях фарміравання сямейнага ладу, каштоўнасцях сямейнага жыцця ў моладзевым асяродку, вывучэнні ролі сям'і ў рэалізацыі сацыяльнай актыўнасці дарослага чалавека і інш.

Паводле «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», лексема сям'я першапачаткова ўзыходзіць да старажытнага індаеўрапейскага кораня *kei- «ляжаць» і ўтворана пры дапамозе суфікса -m-, магчыма, праз перанос значэння «стаянка, паселішча» [2, с. 151]. У энцыклапедычным слоўніку «Нацыі, народы, этнасы» пазначана, што сучасная сям'я – гэта заснаваная на шлюбе або кроўнай роднасці малая група, члены якой звязаны агульнасцю побыту, узаемнай дапамогай, маральнай і прававой адказнасцю [3, с. 204].

Як вядома, на працягу доўгага часу славянскай супольнасці былі ўласцівы вялікія сем'і, якія складаліся з трох і больш пакаленняў і жылі разам. Здаўна ў беларусаў дамінавала патрыярхальная сям'я, у якой галоўная роля, як правіла, належала найбольш вопытнаму і старэйшаму

мужчыну, а задача жанчыны – быць добрай жонкай і маці. Традыцыйна галоўную ролю ў сям'і працягвае выконваць мужчына. Менавіта за такім мужам і бацькам сям'я будзе адчуваць сябе як за каменнай сцяной. Такая думка падтрымліваецца і ў публікацыях рубрыкі «Сямейны барометр» на старонках раённай газеты «Ляхавіцкі веснік»: *На чале кожнай сям'і – сапраўдныя мужчыны. Пабудавалі дамы, гадуюць сыноў, дочак, падтрымліваюць і дапамагаюць сваім прыгожым паловам. Жанчыны – верныя сяброўкі і клапатлівыя маці — паспяваюць не толькі ствараць утульнасць і прыгажосць у дамах, а, наогул, маюць актыўную жыццёвую пазіцыю* (Адзін за ўсіх, усе за аднаго. 20.05.2014); *Тата – сапраўдны гаспадар з залатымі рукамі. Паспеў выканаць мужчынскую праграму: пабудаваў дом, шчаслівы, што мае сына і трох дачок. І хоць жаночая палова сям'і з пяшчотай клапоціцца пра маленькага Максіма, хлопчык усё ж з усіх родных асабліва выдзяляе бацьку – ходзіць за ім па пятах* (Дамашні вернісаж на Каштанавай. 16.08.2019). У матэрыяле «Шчаслівы экіпаж. Жыве такая сям'я ў Ляхавіцкім раёне» сям'я марыць пра тое, *«каб іх муж і тата заўсёды заставаўся лепшым – і ў доме, і на рабоце»* (27.09.2014).

Пасля шлюбу маладыя абавязкова мусілі перасяліцца ў дом мужа. Адваротныя выпадкі ацэньваліся негатыўна ў народзе: пра гэта сведчыць вялікая колькасць парэмій: *Прымак адным вядром восем гадоў ваду носіць* [5, с. 99]; *Прымачы хлеб – сабачы, Прымацкі хлеб сабацкі* [5, 99]; *Доля прымацкая – сабацкая* [5, с. 100]; *Хто ў прымах не бывае, той і гора не знае* [6, 100]; *Прымак – тэй жа парабак* [5, с. 100]; *Пусці зяця, калі няма чорта ў хаце* [5, с.100]. У матэрыяле «Цаглінкі шчасця сямейнага. Жыве ў Ляхавіцкім раёне сям'я» паказана, што вяскоўцы захоўваюць традыцыю па выбары месца жыхарства: «*Калі перад маладымі пасля вяселля паўстала пытанне выбару месца жыхарства, вырашылі "віць гняздо" у роднай вёсцы – у сям'і мужа такая традыцыя: малодшы сын павінен застацца ў бацькоўскім доме ці жыць побач*» (28.06.2014). У савецкім грамадстве развіццё сямейных адносін адбывалася ў кантэксце трохпакаленнай сям'і. Асноўная маса маладых пар жыла з бацькоўскай сям'ёй, што было абумоўлена адсутнасцю эканамічных магчымасцей для набыцця ўласнага жылля. Гэта стварала спецыфічную псіхалагічную атмасферу, пры якой функцыянальныя ролі былі пераблытаныя [4, с. 52–53].

Галоўнай мэтай сям'і паўсюдна лічылася нараджэнне дзяцей, выхаваннем якіх займаліся не толькі бацькі, але і іншыя дарослыя яе

члены [6, с. 613]. На Ляхавіччыне дастаткова паспяховых шматдзетных сямей, ёсць узорныя дамы сямейнага тыпу, замяшчальныя сем'і: 3 дамы сямейнага тыпу, у якіх выхоўваюцца 16 дзяцей, 39 прыёмных (54 дзіцяці) і 27 апякунскіх (35 хлопчыкаў і дзяўчынак). Гэта тэма шырока асвятляецца ў раённай газеце. Журналісцкія публікацыі пацвярджаюць думку, што дзеці – гэта аснова сям'і, божы дар, неверагодная радасць: ***Кветкі і дзеткі, дзеткі і кветкі*** *– ад перамены парадку слоў у спалучэнні натхнення, шчасця і прыгажосці не становіцца менш. Штодзённыя клопаты, хваляванні і праблемы адступаюць перад непасрэднасцю і шчырасцю маленькіх гарэзаў, перад іх сонечнымі ўсмешкамі.* ***Яны, падарунак лёсу****, упрыгожваюць жыццё і напаўняюць яго асаблівым сэнсам.* ***Самае нязменна дарагое****, што ёсць у жыцці чалавека, –* ***дзеці****. Гарэзлівыя і шчырыя, цікаўныя і наіўныя, усмешлівыя і не па ўзросце сур'ёзныя,* ***яны – наша ўсё*** (Нашы дзеткі – нашы кветкі. 04.06.2015). *Замілавальныя і здольныя абяззброіць усяго толькі ўсмешкай. Бязмежна любімыя.* ***Яны – сэнс нашага жыцця, яго галоўныя героі, цэнтр увагі****, вакол якога круцяцца будні і святы дарослых* (Цудоўнае наша ўсё! 02.06.2014). ***Аснова іх шчасця – дочкі*** *Анастасія, Варвара, Валерыя і сын Максім. Пра сябе гавораць, што нічым ад іншых не адрозніваюцца, звычайная сярэднестатыстычная сям'я. А сябры і знаёмыя Ярашаў лічаць, што такіх бацькоў – пашукаць. –* ***Дзеці – гэта радасць****, – сцвярджае Алена. – Яны натхняюць, напаўняюць жыццё сэнсам. За іх шчырыя ўсмешкі можна зрушыць горы* (Дамашні вернісаж на Каштанавай. 16.08.2019).

Канцэпт «сям'я» дазваляе прасачыць яго сувязь з канцэптам «дом», і гэта сувязь адносіцца да самых значных у свядомасці чалавека: *У кожнага чалавека павінен быць свой дом. Але гэта не толькі і не столькі дах над галавой. Галоўнае – сям'я, блізкія людзі, якія цябе разумеюць, чакаюць і абавязкова любяць* (Шчасце па асабістым праекце. 11.06.2015).

Такім чынам, на матэрыяле публікацый можна сцвярджаць, што *сям'я* займае важнае месца ў беларускамоўнай карціне свету сярод найвышэйшых сацыяльных каштоўнасцей, валодае высокім патэнцыялам для разумення характару і асаблівасцей культуры беларускага народа ў цэлым.

У канцэпце «сям'я» адбываецца пашырэнне семантычнай структуры і гэта служыць адлюстраваннем змен, якія адбываюцца ў рэчаіснасці. Вынікам пашырэння семантыкі слова стала метафарычнае ўжыванне: *сям'я – гэта дом, сям'я – гэта дзеці.* Заслугоўвае вялікай павагі той

факт, што раённая газета «Ляхавіцкі веснік» сваёй рубрыкай «Сямейны барометр» і шчырымі публікацыямі ў ёй падтрымлівае імідж сям'і.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Колесникова Г. И.* Социология и психология семьи. Ростов н/Д : Феникс, 2007. 508 с.
2. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / уклад.: М. Я. Абрагімовіч [і інш.]; гал. рэд. Г. А. Цыхун ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. Мінск : Беларус. навука, 2010. Т. 13. 351 с.
3. Нации, народы, этносы : энцикл. словарь / сост.: О. А. Михневич, А. А. Челядинский. Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. 264 с.
4. Лингвострановедение: методы анализа, техника обучения: второй межвуз. семинар по лингвострановедению, 10–11 июня 2004 г.: сб. ст. : в 2 ч. / Моск. гос. ин-т междунар. отношений (Ун-т) МИД России. М., 2005. Ч. 2 : Концепт «семья» в аспекте лингвострановедения / отв. ред.: Л. Г. Веденина. 202 с.
5. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / рэд. А. С. Фядосік. Мінск : Навука і тэхніка, 1976. Кн. 2. 616 с.
6. Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. Т. 4. М. : Международные отношения, 2009. 656 с.


## ЖУРНАЛИСТИКА И ИНТЕРНЕТ-ЛОВУШКИ НОВОГО ВРЕМЕНИ


***В. И. Шимолин***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*Shimolin_V46@mail.ru*



Публикации новейшего времени полны противоречий в оценках перспектив развития журналистики и фотожурналистики в условиях невиданного ранее распространения вещательных органов. Их непрофессиональные владельцы зачастую не понимают смысла и силы публичного слова, значения сюжета, выбора темы. Популярность подобных публикаций измеряется ныне не комментариями читателей, а бессмысленными лайками. Количество интернетовских выбросов растет, но редко переходит в качество. Автор статьи размышляет о путях очистки информационного пространства.



***Ключевые слова:*** фотография; фотожурналистика; правдивость; документальность; объективность; конвергенция; глобализация; идеология.